Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Ваш дэвіз — больш слухайце і менш гаварыце. Вам неабходная гнуткасць у сітуацыях, якія пастаянна змяняюцца, вучыцеся кіраваць сваімі эмоцыямі. Давядзецца заклікаць на дапамогу інтуіцыю і мудрасць. Пажадана перагледзець свой распарадак дня, паспрабуйце ўраўнаважыць рабочы час і час, прысвечаны дому і хатнім справам.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень можа стацца спрыяльным у плане ўрэгулявання адносін з партнёрамі па рабоце і ў асабістым жыцці. Зносіны з цікавымі людзьмі дазволяць здабыць крыніцу дадатковага заробку. У аўторак мэтанакіраванасць і стараннасць на рабоце адзначацца выдатнымі вынікамі. У сераду ганіце прэч ад сябе тугу і сумныя думкі. У суботу не расказвайце навакольным пра свае поспехі і грандыёзныя планы, бо гэта можа стаць прычынай зайздрасці.

БЛІЗНЯТЫ. Засяродзцеся на рабоце, яна прынясе задавальненне і прыбытак. Аднак і пра адпачынак не забывайце. Вас чакае цікавае падарожжа ў прыемнай кампаніі. Атрымаеце масу ўражанняў, адчуеце расслабленне і спакой. Паспрабуйце быць больш цярплівымі да нязначных недахопаў навакольных. Вас любяць і шануюць, паверце ў гэта. Асцярожней з жаданнем быць залішне экстравагантнымі і імкненнем усё змяніць.

РАК. Прафесійная сфера запатрабуе ад вас пільнай увагі і непасрэднага ўдзелу. Важна ўціхамірыць ганарыстасць і не сварыцца з навакольнымі. Аўторак — спрыяльны дзень для максімальнай актыўнасці на рабоце і рашучых дзеянняў на любоўным фронце. Субота станецца прыдатным днём для візіту да родных і сямейнага абеду.

ЛЕЎ. Тыдзень абяцае быць насычаным падзеямі. Вашы планы будуць увасабляцца ў жыццё імклівымі тэмпамі. Палепшацца адносіны з навакольнымі, будуць вырашаны практычна ўсе канфліктныя сітуацыі. Можаце разлічваць на падтрымку і дапамогу сяброў. І вы паспрабуйце нікому не адмаўляць у дапамозе і выконваць неабходную работу своечасова. І тады можаце разлічваць на поспех.

ДЗЕВА. Спатрэбяцца арганізатарскія здольнасці і новыя ідэі. Каб дасягнуць станоўчага выніку ў дзелавым супрацоўніцтве, давядзецца прыкласці максімум намаганняў. Затое і ўзнагароджаныя яны будуць па заслугах. Паспрабуйце не адкладаць справы на потым, вырашайце іх адразу. У канцы тыдня ўпэўненасць ва ўласных сілах дапаможа разабрацца са складанасцямі, так што не варта дазваляць сабе ўпадаць у роспач.

ШАЛІ. Паменш часу праводзьце за камп'ютарам, сацыяльныя сеткі не заменяць асабістых зносін. У аўторак не варта сумнявацца ва ўласных сілах — гэтым разам вы зможаце ўвасобіць у жыццё свае задумы. Калі хочаце добра зарабіць, сачкаваць не варта. Выхадныя пажадана правесці за горадам.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні вас чакаюць яркія і цікавыя падзеі. Улавіце напрамак ветру перамен, каб максімальна скарыстацца спрыяльнымі магчымасцямі. Будзьце сумленныя, і тады ніякія чуткі не змогуць нашкодзіць. У аўторак можаце адчуць, што назапашаныя справы не церпяць адкладу. Выразна сплануйце гэты дзень: тады атрымаецца зрабіць усё, што неабходна. Сфера асабістага жыцця вельмі важная для вас, не бойцеся прызнацца ў гэтым сабе і вашаму выбранніку.

СТРАЛЕЦ. Пастаўцеся з увагай да новых знаёмых і да іх прапаноў, яны могуць быць выгадныя. Серада — добры дзень для таго, каб даведацца штосьці новае або пачаць вучыцца. У чацвер пастарайцеся стрымліваць эмоцыі, уважліва сачыце за сваімі словамі і паводзінамі суразмоўнікаў. Магчыма, такім чынам пазбегнеце буйных непрыемнасцяў. У пятніцу можаце адчуць у сабе ўсплёск ініцыятыўнасці і прадпрымальнасці. Паспрабуйце злавіць момант і прымяніць гэтыя якасці з максімальнай карысцю. У нядзелю адпачніце ад спраў.

КАЗЯРОГ. Надыходзіць спрыяльны тыдзень для ўстанаўлення карысных і выгадных знаёмстваў, пошуку дадатковых заробкаў. Дарэчы, зараз той час, калі варта даверацца першаму ўражанню аб людзях. У панядзелак будзьце вельмі ўважлівыя да працоўных спраў: лепш усё праверце, калі не хочаце потым выпраўляць дапушчаныя памылкі. У сераду не варта нічога вырашаць і з кімсьці расставацца. У выхадныя добра б наведаць сваякоў і з'ездзіць за горад.

ВАДАЛІЙ. Не перабольшвайце сваёй значнасці, каб не парушыць балансу ў калектыве. Асабліва вялікая небяспека сапсаваць адносіны з калегамі. Калі знойдзецца магчымасць адправіцца ў падарожжа, яе абавязкова трэба выкарыстоўваць. У сераду праявіце ўсю сваю дыпламатычнасць. У пятніцу ад вас спатрэбіцца больш увагі і клопату да блізкіх людзей. Нядзелю лепш правесці ў адзіноце, у адваротным выпадку рызыкуеце пасварыцца з сябрамі.

РЫБЫ. Паспрабуйце не нервавацца і не спрабаваць паспець усё і адразу. Будзьце прасцейшыя і менш разважайце над тым, хто і што можа пра вас сказаць, настройвайцеся на станоўчыя эмоцыі. Прадумайце свае дзеянні да дробязяў — так будзе прасцей рэалізоўваць вялікія планы. У выхадныя кантактуйце з сябрамі і сябрамі сяброў, карыстайцеся спрыяльным для ўстанаўлення кантактаў момантам. Ну і, вядома, адпачывайце, радуйцеся, весяліцеся.

Даты Падзеі Людзі

11 МАЯ

1534 год — меркаваная дата нараджэння Цыпрыяна Базыліка, паэта, перакладчыка, кампазітара, кнігавыдаўца. З 1556 (?) года — прыдворны музыкант, адзін з кіраўнікоў капэлы ў канцлера ВКЛ М. Радзівіла Чорнага. Складаў рэлігійныя спевы, якія выдадзены асобнымі кнігамі ў Брэсце (1556, 1558, 1559), а таксама ўвайшлі ў зборнік «Песні хвал боскіх». У 1560—1570-я гады — уладальнік і кіраўнік Брэсцкай друкарні, дзе надрукаваў Брэсцкую біблію (1563), «Размову паляка з ліцвінам» (каля 1564) і інш. Памёр пасля 1600 года.

1894 год — нарадзіўся (в. Слабада, цяпер Уздзенскі раён) Сцяпан Герасімавіч Булат, беларускі дзяржаўны і партыйны дзеяч, журналіст. Вучыўся ў Мінскім настаўніцкім інстытуце. З 1918 года — член арганізацыі «Маладая Беларусь». У 1920-м, у час польскай акупацыі, — член Беларускай камуністычнай арганізацыі і Паўстанцкага камітэта; арганізатар партызанскіх атрадаў на Міншчыне. З ліпеня 1920-га — у Мінскім губернскім аддзеле народнай асветы, загадчык аддзела ЦК КП(б) Б, адначасова рэдактар газеты «Савецкая Беларусь», заснавальнік і рэдактар газеты «Беларуская вёска». З лютага 1921 года — член ЦБ КП(б)Б, сакратар і загадчык аддзела ЦК КП(б)Б. Памёр у 1921 годзе.

1899 год — нарадзіўся (г. Вазнясенск Маскоўскай губерні) Глеб Паўлавіч Глебаў, беларускі акцёр, народны артыст Беларусі і СССР. Сцэнічную дзейнасць пачаў у аматарскім гуртку, арганізаваным яго бацькам. З 1926 года ў Беларускім тэатры імя Янкі Купалы (у 1943—1947 гг. — мастацкі кіраўнік). Бліскучы камедыйны акцёр, майстар пераўвасаблення. Даваў дакладную і па-тэатральнаму яркую характарыстыку вобраза, валодаў імправізацыйным дарам, пластыкай, выключным камедыйным майстэрствам. Найлепшыя ролі ў беларускай і класічнай драматургіі: Павел Няміра («Айчына» К. Чорнага), Халімон («Партызаны» К. Крапівы), Харкевіч («Пагібель воўка» Э. Самуйленка), Туляга («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы) і інш. Здымаўся ў кінафільмах: «Канстанцін Заслонаў», «Несцерка», «Палеская легенда», «Першыя выпрабаванні» і інш. Шырокую папулярнасць набыў як чытальнік на радыё. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1967 годзе.

1990 год — створаны Мазырскі драматычны тэатр імя І. Мележа. Заснавальнік і першы кіраўнік — М. Колас. У рэпертуары тэатра — пастаноўкі твораў беларускай, рускай і сусветнай класікі, а таксама сучасных аўтараў: «Прымакі» Я. Купалы, «Кошкін дом» С. Маршака, «Трыбунал» А. Макаёнка і іншыя.

1864 год — нарадзілася Этэль Ліліян Войніч, англійская пісьменніца, перакладчыца. Аўтар рамана «Авадзень», «Здымі абутак твой», «Перарваная дружба» і іншых твораў. Памерла ў 1960 годзе.

1900 год — быў спушчаны на ваду бронепалубны крэйсер першага рангу Балтыйскага флоту «Аўрора». Закладзены ў маі 1897-га. У 1948 годзе пастаўлены на вечную стаянку каля Петраградскай набярэжнай.

1904 год — нарадзіўся Сальвадор Далі, іспанскі жывапісец, графік, скульптар, рэжысёр, вядучы прадстаўнік сюррэалізму. Памёр у 1989 годзе.

1939 год — пачаўся ўзброены канфлікт паміж СССР і Японіяй каля ракі Халхін-Гол на тэрыторыі Манголіі. Заключныя баі адбыліся ў апошніх числах жніўня і завяршыліся поўным разгромам 6-й асобнай арміі Японіі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.15	20.58	15.43
Віцебск —	4.59	20.53	15.54
Магілёў —	5.05	20.48	15.43
Гомель —	5.11	20.35	15.24
Гродна —	5.31	21.12	15.41
Брэст —	5.38	21.06	15.28

Месяц

Маладзік 5 мая.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Ганны, Жанны, Марыі, Яны, Аўсея, Віталя, Кірылы, Максіма.*
К. *Міры, Ігната, Кірылы, Францішка, Якуба.*

Фота Ганны КУРАК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Як цяжка выхоўваць сына... Якога нарадзіла табе свякроў.

— Мілая, а чаму ты плакала падчас сексу?

— Мне сон страшны прысніўся.

Не ем пасля шасці вечара ўжо тры дні. Сышлі: жывот — на 0,001 %, бакі — на 0,001 %, жаданне жыць — на 95 %.

Урок сексуальнага выхавання. Настаўніца:

— Дзеці, мы пачынаем вывучаць цікавы прадмет. Вельмі хутка ў нашым класе хлопчыкі зацікавяцца дзяўчынкамі, а дзяўчынкі — хлопчыкамі...

Вовачка:

— Мар'я Іванаўна, а можна тыя, хто ўжо сексам займаўся, пойдуць гуляць у футбол?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1597.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 мая 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12